# АКТЫВІЗАЦЫЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У 90-Я ГАДЫ XX СТАГОДДЗЯ

**Н. І. Рыбко**

## УСТУП

Наша Беларусь у якасці сучаснай дзяржавы Рэспублiцы Беларусь з'яўляецца адносна маладой, ёй усяго 18 год. У сувязі з гэтым тэма, назва якой гучыць «Актывізацыя грамадска-палітычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 90-я гады XX стагоддзя», можна лічыць актуальнай, бо яна раскрывае супярэчныя пытанні фарміравання сёняшняй дзяржаўнасці на нашай Радзіме. І ў дадатак да гэтага актывізацыя мас, грамадска-палітычны рух і станаўленне шматпартыйнасці пасля амаль што стогадовага таталітарнага рэжыму выклікае асаблівую цікавасць.

Мэтай майго даследвання з'яўляецца разгляд адносінаў непасрэдна паміж уладнымі дзяржаўнымі інстытутамі і грамадскімі аб'яднаннямі наконт погляду на далейшы лёс і развіццё краіны, які не заўседы быў аднолькавым і кампрамісным. Такім чым маё даследванне ахоплівае канфлікты і сутычкі поглядаў, якія ўзнікалі паміж гэтымі бакамі. А таксама нельга абысці бокам і падзеі, якімі гэтыя адносіны суправаджаліся, іх чыннікі і вынікі, і, безумоўна, стаўленне да ўсяго гэтага міжнароднай грамадскасці.

Тэма раскрываецца пры дапамозе аналізу праведзеных у Рэспубліцы рэспубліканскіх рэферэндумаў і выбарчых кампаній у парламент і на пост кіраўніка краіны.

## РЭСПУБЛІКАНСКІЯ РЭФЕРЭНДУМЫ

За час існавання Рэспублікі Беларусь як самастойнай дзяржавы было праведзена тры рэспубліканскія рэферэндумы: 14 траўня 1995 года, 24 лістапада 1996 года і 17 кастрычніка 2004 года, якія адыгралі значную ролю не толькі на этапе станаўлення суверэннай дзяржавы, але і ў далейшым жыцці краіны. Пытанні, якія выносіліся на ўсенароднае галасаванне, ў асноўным датычыліся змен і дапаўненняў Канстытуцыі 1994 года [1]. Характэрным для ўсіх рэферэндумаў з'ўлялася тое, што першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка атрымаў абсалютную падтрымку грамадзян краіны па ўсіх ініцыянаваных ім пытаннях. Такія вынікі выклікалі рэзананс ў грамадстве, падзяліўшы яго на дзве часткі: прыхільнікаў першага Прэзідэнта краіны і яго супернікаў.

Напрыклад, па меркаванню незалежных назіральнікаў, вынікі рэферэндуму 1995 года ўзмацнілі раскол у беларускім грамадстве. У прыватнасці, пад выглядам надання рускай мове роўнага статуту з

беларускай фактычна пачалося выцясненне мовы тытульнай нацыі з шэрагу найважнейшых сфер дзяржаўнага і грамадскага жыцця, рэзка знізілася яе прэстыжнасць. Апазіцыйна наладжаная частка грамадзян таксама балесна ўспрыняла зварот да прасавецкай дзяржаўнай сімволікі. А падтрымка на плебісцыце курсу на эканамічную інтэграцыю з Расіяй, на думку апанентаў, паставіла пад пагрозу суверэнітэт Беларусі [2].

Канчатковая кропка ў фармаванні двух супрацьстаялых бакоў была пастаўлена вынікамі рэферэндуму 1996 года. Незаконнымі прызнаў гэтыя вынікі Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, пра што было прынята адпаведная заява 26 лістапада 1996 года [3]. Рашучы пратэст супраць незаконных дзеянняў выканаўчай улады ў перыяд падрыхтоўкі рэферэндуму і датэрміновага галасавання па пытаннях рэферэндуму выявіла Міжнародная Хельсінская Федэрацыя па правах чалавека і Беларускі Хельсінскі Камітэт. Шырокі спектр меркаванняў аб рэферэндуме адбіла айчынная і замежная прэса.

Як і папярэднія рэферэндумы референдум 2004 года суправаджаўся актыўнасцю апазіцыйных палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў.

**ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ**

За час суверэнітэту краіны прайшло ўжо чатыры выбарчыя кампаніі ў прадстаўнічы орган Рэспублікі Беларусь: 14 траўня 1995, 15 кастрычніка 2000, 17 кастрычніка 2004 і апошнія ня так даўно – 28 верасня 2008 года, у якой аўтар непасрэдна прымала ўдзел у якасці сябра ўчастковай выбарчай камісіі учатка № 290 Паўднёва-Заходняй выбарчай акругі № 99 г. Мінска.

Выбарчыя кампанія прахадзілі вельмі жвава ў адрозненне ад аналагічных у перыяд СССР. Чыннікамі таму паслужыла прыняцце новых заканадаўчых актаў, у тым ліку і сучаснага Выбарчага кодэкса РБ 2000 года [4], у адпаведнасці з якімі выбары маглі праводзіцца на альтэрнатыўнай аснове, і ў працэссе выбарчай кампаніі змаглі прыняць удзел палітычныя патрыі і грамадскія аб’яднанні. Але, нягледзячы на гэта, колькасць прадстаўнікоў у паламенце ад апазіцыйных партый і грамадскіх аб’яднанняў с кожнымі выбарамі станавілася ўсе меньш, пакуль на выбарах 2008 года апазізыныя партыі не атрымалі ніводнага мандату. Выбары ў парламент 2000, 2004 і 2008 гадоў не былі прызнаны міжнароднай грамадскасцю, акрамя Расійскай Федэрацыі.

**ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

У канцы 80-х – пачатку 90-х гг. XX ст. надышоў крызіс Савецкай сістэмы. Пачалі абвастрацца пытанні па шэрагу праблем сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця ўсіх тых «дэталяў», якія ўваходзілі ў склад Савецкай машыны.

Немагчымасць іх вырашэння прывяла да распаду Савецкага Саюза і да станаўлення суверэнных дзяржаў, у тым ліку і сучаснай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. Кропкай, якая завяршыла працэс аддзялення Рэспублікі Беларусь ад СССР і прывяла нас да незалежнасці, стала Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прынятая 15 сакавіка 1994 года. Пасля чаго пачалося будаванне новай палітычнай сістэмы на сусветнай мапе. У адпаведнасці з Канстытуцыяй уводзіўся выбарчы пост Прэзідэнта рэспублікі, што спрыяла актывізацыі насельніцтва і аб'яднання яго ў розныя рухі і палітычныя партыі, якія вялі барацьбу за ўладу. Асабліва абвастрэнню гэтай барацьбе надалі ініцыянаваныя першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь рэспубліканскія рэферэндумы, рашэнні якіх надзялялі вялікімі паўнамоцтвамі кіраўніка дзяржавы.

За ўвесь час існавання сувярэннай дзяржавы Рэспублікі Беларусь прайшло тры выбарчыя кампаніі на пасаду кіраўніка дзяржавы: 23 чэрвеня 1994 года, 9 верасня 2001 года і 19 сакавіка 2006 года. Па выніках усіх трох выбарчых кампаній перамогу атрымаў А.Р.Лукашэнка з вялікім адрывам ад сваіх апанентаў.

Усе вышэйназваныя падзеі суправаджаліся бурнай рэакцыяй насельніцтва, сутычкамі апазіцыйных і дзяржаўных сіл, асабліва выбары 2006 года, калі мітынг на Кастрычніцкай плошчы працягваўся 5 дзён. Не засталіся выбары Прэзідэнта РБ нецікавымі і для замежных дзяржаў. У выніку выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2001 і 2006 года не былі прызнаныя легітымнымі з боку краін Заходняй Еўропы і ЗША, а таксама апазіцыйна настроенымі палітычнымі партыямі і грамадзянамі Беларусі.

**ВЫНІК**

Нягледзячы на паўналецце і, здавалася б, досыць развітую і дэмакратычную палітычную сістэму фарміраванне незалежнай Рэспублікі Беларусь працягваецца і зараз. Застаецца вырашыць яшчэ шмат пытанняў і трэба будзе прыняць не адзін выбар, каб зрабіць нашу Беларусь светлай і шчаслівай.

**Літаратура**


1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэферэндуме 1996 і 2004 гадоў.
2. Интернет-адрес: http://belaruselections.info/archive/referendum1995/.
3. *Котляров И. В.* Политические партии Беларуси: анализ, проблемы, прогнозы. Мн., 1996 г.
4. Избирательный кодекс Республики Беларусь от 11 февраля 2000 г. N 370-З, в ред. (посл) Закона РБ от 06.10.2006 N 166-З // Нац. реестр правовых актов РБ 15 февраля 2000 г. N 2/145.